**УДК 39**

# ВОБРАЗ «ПАДАРОЖНАГА БОГА» Ў ЛЕГЕНДАХ АБ З'ЯЎЛЕННІ САКРАЛЬНЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ ЛАНДШАФТУ (ПА ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ)

***Д. В. ЖУКАЎ***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У артыкуле разглядаецца вобраз «падарожнага» Богаў кантэксце з'яўлення сакральных элементаў ландшафту. Асаблівая ўвага звернута на групу легенд, якія апавядаюць пра з'яўленне святых азёр, крыніц, камянёў. Тэма даследавання актуальная, бо вобраз падарожнага Бога з'яўляецца не толькі важнай часткай беларускага фальклору, але і неад'емным кампанентам карціны светы.*

***Ключавыя словы:*** *«Падарожны» Бог, легенды, сакральныя геаграфія, ландшафт Падзвіння, прырода.*

Немалаважнае месца ў фальклорным ландшафце беларусаў займаюць уяўленні пра падарожнага Бога. Вобраз падарожнага Бога з'яўляецца адным з найбольш спецыфічных і адметных у народнай прозе беларусаў. Этнаграфічныя экспедыцыі Полоцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, праведзенныя на тэррыторыі Віцебшчыны ў 1995-2020 гадах, зафіксавалі значны аб'ём матэрыялу, які адлюстроўвае сімволіку вобраза Бога ў карціне свету сельскага насельніцтва Падзвіння.

У беларускім фальклоры існуе значны комплекс легенд, паводле якіх Бог выступае прычынай з'яўлення сакральных элементаў ландшафту. Спецыфікай вывучэння сакральнай геаграфіі ў Беларусі з'яўляецца яе першапачаткова міждысцыплінарны характар і перавага агульнаэтнічнай парадыгмы пры разглядзе асобных прыродных аб'ектаў (крыніц, азёр, валуноў), якія маюць сакральны статус у традыцыйнай карціне свету мясцовага насельніцтва: «Крыніцы і азёры (камяні і іншыя прыродныя аб'екты), суаднесеныя ў народных уяўленнях з іншасветам, уваходзяць у катэгорыю «сакральная геаграфія» толькі пры максімальна шырокім разуменні апошняй як сукупнасці элементаў прыроднага ландшафту, якія ў калектыўнай культурнай памяці суадносяцца з іншасветам і яго прадстаўнікамі ў іх міфалагічнай праекцыі і выразна супрацьпастаўляюцца сферы прафаннага (чалавечага)» [8, с. 22]. Азёры і крыніцы як каналы камунікацыі з іншасветам з'яўляюцца асноўнымі аб'ектамі сакральнай геаграфіі ў рамках культурнага ландшафту беларусаў. Сярод легендарных азёрау разгляданага рэгіёну асаблівае месца займаюць водныя аб'екты з найменем «святое» (ці вытворным ад яго), якое адназначна указвае на сакральны статус дадзенага локуса ў рамках лакальнага культурнага ландшафту: «Усе гідронімы такога тыпу фіксуюцца толькі на беларускім участку сучаснага Віцебска-Пскоускага памежжа» [7, с. 375]. У XX – пачатку XXI ст. практычна ніводнае возера, з ліку «святых», не адносіцца да катэгорыі вясковых святынь і не з'яўляецца аб'ектам ці прасторай мэтанакіраваных рытуальных дзеянняў. Гэта значыць, што: «Статус азёраў як сваесаблівых каналаў камунікацыі з іншасветам адлюстраваны ў традыцыйных уяўленнях найбольш у фальклорным ключы, але функцыянальнай рэалізацыі ў рамках народна-рэлігійных практык знаходзіць за рэдкім выключэннем» [8, с. 22].

У касмаганічных легендах з'яўленне водных аб'ектаў суадносіцца з часам першастварэння і дзейнасцю Дэміўргаў (асабліва з дзейнасцю Бога-Дэміўрга): «*А вось як сьніш азяро – гэта да апаснасці. А умыванне у азяры – да радасці. Сьніць балота – гэта значыць нешта нядобра, неблагапрыятнае становішча. А для закаханых – ізмена у каханьні. Але ж і балоты, і азёры стварыў Бог*» (Пастаўскі р-н) [10, с. 183-184].

Фіксуюцца паданні, паводле якіх Бог у выглядзе старога старца ходзіць па зямлі ў пошуках начлега, але ніхто не дае яму прытулак: *«Увечары старац завітаў у вёску і прасіўся на начлег. Але ніхто не пускаў яго да сябе ў хату. Толькі адна бедная ўдава з дзіцем дала яму прытулак. Раніцой стары загадаў жанчыне збірацца і ісці за ім прэч з вёскі, адно толькі не азірацца. Жанчына забрала дзіця і рушыла за старым. Калі яны выйшлі за вёску, ззаду раптам пачуўся страшэнны грукат ды лямант. Жанчына не вытрымала і азірнулася. І ўмомант яе вёска знікла пад зямлёю, а на тым месцы сталася возера»* [2, с. 37-38].

Падобную гісторыю мае возера Крывое (сінанімічна «святое») ва Ушацкім раёне: *«Стаяла вялікая вёска ці горад. Бог ішоў і прасіўся на начлег, яго не пусцілі нідзе, а толькі пусціла бедная ўдава ў апошняй хаце і раніцай Бог сказаў: забірай дзяцей і ісці з вескі, не азіраючыся. Яна ішла, а за спіной - трэск, крыкі. Не вытрымала жанчына - азірнулася і скамянела на гары як баба-камень. А на месцы вескі ўтварылася возера - крывой формы. Нібыта фюрма возера паўтарае форму вескі, вуліцы. Возера не замерзне і не сыйдзе з яго лед, пакуль не ўтопіцца чалавек. Возера кожны год патрабуе ахвяру – вясной*

*і восенню»* [11, с. 201]. Падобныя паданні захоўваюць у сабе ўяўленні нашых продкаў пра водны хаос і сусветны патоп, які насылаецца на зямлю за людскія грахі і непаслушэнства перад Богам. Блізкія па сюжэце легенды былі зафіксафаны ў Талачынскім, Ушацкім, а таксама ў Барысаўскім і Рагачоўскім раёнах.

Аналіз фальклорных сюжэтаў паказвае, што «ў якасці асноўнай прычыны знікнення паселішча (храма) фігуруе канфлікт, звязаны з парушэннем (сутыкненнем) светапоглядных (маральна-этычных, рэлігійных) каштоўнасцяў і нормаў. Іначай кажучы, гэта канфлікт паміж калектывам і богам (царквой), але Богам, для носьбітаў фальклорнай традыцыі XIX-XX стст., ужо безумоўна хрысціяскім» [5, с. 194].

Так, паводле падання, возера ля в. Навасёлкі Дзяржынскага раёна ўтварылася на месцы вёскі, жыхары якой не захацелі прымаць новую веру, запярэчыўшы Богу, які з'явіўся ў выглядзе «дзядка»: *«Тых, што не пайшлі маліцца, дзядок адвёў крышку далей і ўваткнуў у зямлю кіёк... З натоўпу выйшаў адзін здаровы маладзец і вырваў кіёк... з гэтай ямкі хлынула вада і затапіла вёску разам з людзьмі. Засталіся толькі тыя, якія былі ў царкве»*[4, с. 410].

На тэрыторыі Беларускага Падзвіння вядома 14 азёрау з найменнем «святое» ці вытворным ад яго іх геаграфія размяркоуваецца наступным чынам: «Бешанковіцкі раён – 2 аб’екты, Браслаускі – 1, Верхнядзвінскі – 1, Віцебскі – 1, Лепельскі ра¨ен – 1, Полацкі – 3, Сенненскі – 2, Чашніцкі р-н – 3 аб’екты» [7, с. 376].

Не меньш распаўсюджанай катэгорыяй аб'ектаў сакральнай геаграфіі Падзвінскага рэгіёна, безумоўна, з'яўляюцца «святыя» крыніцы: *«Крыніца «Ізус» завецца. Ну, Ісус Хрыстос. Можа Ісус тую ваду асвяціў. Так гаварылі. Як раньшэ малыя былі, у школу хадзілі, дык там палаценцы віселі. Крэст такі стаяў, палаценца вісела і лажылі капейкі. Крэст і там полачка. І цяпер ложуць. Там з-пад зямлі б’е фантанчык і вада цераз балота і ў рэчку цячэ. Хадзілі ў Чысты чацверг. Нада да сонца схадзіць, вады набраць, памыцца, каб дзяўчына красівай была, што б харошы малец замуж узяў. Хадзілі і перад Калядамі. Перад Пасхай абязацельна. І я хадзіў, добрую дзяўчыну хацеў узяць. Вадой хату абпырсквалі, скаціну, і самі мыюцца. Яна стаіць доўга, не мутнеіць»* [6, с. 112]. Вельмі высокі семіятычны статус «святых крыніц» выяўляецца ў іх надзвычайных лекавых здольнасцях, што, ва ўяўленнях мясцовага насельніцтва, маюць універсальны характар: «*Во, як дзіцёнак ня спіць, то даюць яму гэную вадзічку. Ці можа тамжывоцік круціць яму, ці напужаўся чаго, то ўсё вадзічку гэтую даюць і змываюць*» [9, с. 46]. Калі Святая крыніца размешчана ў балоце, то ёй прыпісваюць лячэбныя ўласцівасці за кошт ўзаемасувязі з першай фазай касмагенезу, калі дзейнасці Бога-дэміурга папярэднічае стварэння «цэнтра» на фоне воднага хаосу: «Калі свет яшчэ толькі зачынаўся, нідзе нічога не было. Усюды была мёртвая вада, пасярод вады тырчэў нейкі камень». Статычная прастора балота, у якой вылучаецца дынамічнае ядро (крыніца), увасабляе два полюса сатварэння сусвету – in statu і in motu. Ідэі нараджэння, абнаўлення, чысціні, руху і жыцця ў цэлым, якія звязваюцца ў традыцыйным светапоглядзе з крыніцай, у дадзеным выпадку прадметна і наглядна канкуруюць з ідэямі смерці, знікнення, нерухомасці, бруду, трывала суаднесеных з уласна балотам. Такая дыхатамія з’яўляецца аптымальнай у кантэксце сімвалічнай прагматыкі і функцыянальнасці вясковых святыняў падобнага тыпу: да іх ідуць, каб пакінуць хваробу і атрымаць здароўе» [5, с. 170].

Некаторые сюжэты сведчаць аб тым, што раней, калі Бог хадзіў па зямлі, камяні былі мяккія, што дазваляла яму пакідаць на іх свае сляды. Такія камяні маюць назву «камяні-следавікі»: «Адметнай асаблівасцю гэтых камянёў з'яўляюцца адбіткі слядоў на паверхні ў выглядзе ступні чалавека або лап звяроў і свойскіх жывёл» [3, с. 31]. У светапоглядзе вясковага жыхара Паздвіння, гэты тып камянёў з’яўляецца аб’ектам, які мае сувязь з нечым магічным, боскім, таму і наделены надзвычыйнымі ўласцівасцямі: «камни-следовики – это место непосредственно иерофании (проявления божественного), точки пространства, отмеченные связью со сферой сакрального и, отсюда, наделен чрезвычайными свойствами» [1, с. 10].

Да так званых «Божых камянёў» ставіліся вельмі пазітыўна, бо, як лічылася, гэтыя камяні малі лекавую сілу: «*Ну, яшчэ старыя прымерна так гаварылі, што Бога сляды. Даўно Бог ішоў, ступіў, ну во і слядкі. А тыя малыя (слядкі) – дык то, ці кот з ім (Богам) ішоў ці сабака. Слядкі там гэтыя чысцілі. Старыя людзі хадзілі і зерне туды, у слядкі, сыпалі, каб добры ураджай быў. – Як сеялі, сыпалі туды? – Ага, як сеялі. Ну, яшчэ хадзілі на Вялічка, яйкі свянцілі. Яшчэ на Троіцу хадзілі. – Як свянцілі? – Яйкі пакладуць у слядкі – во так свянцілі. – А на Тройцу? – Не, на Тройцу не свянцілі. Хадзілі, чысцілі тыя слядкі, ну прыбіралі там старыя бабкі*» (Лепельскі р-н) [10, с. 237]. Пры гэтым, Асацыяцыя каменя з пэўным міфалагічным персанажам вызначае яго энергетычную валентнасць ў народнай карціне свету: ««Богавыя камяні» надзяляюцца звышнатуральнай пазітыўнай (лекавай, прадуцыруюць) сілай, «чортавы камяні» выступаюць як маркеры патэнцыйна небяспечнай зоны» [5, с. 253]

Узгоркавы рэльеф са шматлікасцю водных аб’ектаў з’яўляецца асаблівасцю ландшафту Паўночнай Беларусі – гэта абумовіла той факт, што ў міфапаэтычнай карціне свету сакральны статус

маюць азёры, крыніцы і камні. Элементы прыроднага ландшафту у традыцыйным светапоглядзе беларусаў Падзвіння не ўспрымаюцца як выключна крыніцы рэсурсаў для гаспадарчай дзейнасці. Яны разглядаюцца ў якасці неад’емных кампанентаў цэльнай карціны свету, якія ўзыходзяць да часоў «першастварэння».

ЛІТАРАТУРА

1. Володина Т.В. Люди и камни: метаморфозы и коммуникация (белорусская традиция) // Живой камень: от природы к культуре / Отв. ред. и сост. Л. О. Зайонц. М.: Институт мировой культуры МГУ, 2015. — С. 133-145
2. Дучыц Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Л.Дучыц, І.Клімковіч.—Мінск: Літаратура і Мастацтва. – 2011. —349 с.
3. Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / А. К. Карабанаў [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут прыродакарыстання. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 235 с.
4. Легенды і паданні / [Склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі; Рэд. тома А. С. Фядосік]. — Мн.: Навука і тэхніка, 1983. — 544 с.
5. Лобач У.А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / Уладзімір Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.
6. Лобач, У. А. Сакральная геаграфія Беларускага Падзвіння (па матэрыялах этнаграфічных даследаванняў ПДУ) / У. А. Лобач // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі : матэрыялы Рэспубл. навук. - практычн. канф., Мінск, 13–14 ліст. 2008 г. / Бел. дзярж. ун-т к-ры і мастацтваў;уклад. І. Ю. Смірнова ; рэд. В. А. Лабачэўская. – Мінск, 2008. – С. 109 – 116.
7. Лобач, У.А Сакральныя азёры Віцебска-Пскоўскага памежжа: сімвалічны статус у міфапаэтычнай карціне свету / У. Лобач // Białorutenistika Białostocka. Białystok : Uniwersytet w Białymstoku, 2015. Т. 8. — S. 373 —379.
8. Лобач, У.А. Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пач XX ст.): аўтарэф. дысертацыі на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук / У.А. Лобач. – Мінск, 2003. – 57 с.
9. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 148 с.
10. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.– Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.
11. Пракоф'ева Ю.С. Традыцыйныя уяўленні аб сакральных элементах ландшафту Беларускага Падзвіння (па матэрыялах архіву РГМА «студэнтскае этнаграфічнае таварыства»). Традиционный этнокультурный и языковой ландшафт Витебско-Псковского пограничья в конце XIX – начале XXI вв.: библиографический указатель / Под общ. ред. Н.В. Большаковой; составители: Н.В. Большакова, В.Е. Овсейчик. – Псков: ЛОГОС, 2017. – 168с.